***Перавіспа А. А.**, выхавацель дашкольнай адукацыі дзіцячага сада № 5 г. Шчучына Гродзенскай вобласці*

# Чароўны куфар

## Канспект заняткаў па адукацыйнай галіне «Мастацкая літаратура» для выхаванцаў старэйшага дашкольнага ўзросту (родная мова ў беларускім нацыянальным фальклоры)

***Задачы:***

- *працягваць фарміраваць* уяўленні пра фальклорныя творы розных жанраў (загадка, казка, калыханка, забаўлянка), іх тэматычную разнастайнасць, уменні разумець эмацыянальна-вобразны змест фальклорнага твора, яго характар;
- *развіваць* памяць, цікавасць да твораў фальклору, чуласць да прыгажосці і выразнасці мовы;
- *выхоўваць* культуру чытання, эмацыянальна пазітыўнае стаўленне да твораў фальклору, да культурнай спадчыны народа.

***Абсталяванне:*** куфар, выявы герояў казак (пеўнік з касой, каза, вожык), канверт з загадкамі і карткі з адгадкамі, цацкі зайчыхі і зайчаня, картка з малюнкам, як маці калыша дзіця, дошка, карткі з выявамі па змесце забаўлянкі «Мышка, мышка, дзе была?».

***Метады і прыёмы:***

*наглядны* — дэманстрацыя, назіранне;

*моўны* — пытанні, уступная частка;

*гульнявы* — дыдактычныя гульні (моўныя), выкананне гульнявых дзеянняў, сюрпрызны момант;

*метад візуалізацыі* «Скрайбінг».

***Папярэдняя работа:*** дыдактычныя гульні: «Пазнай казку», «Чацвёрты лішні», «Чаго не стала?», «З якой казкі герой?»; чытанне беларускіх народных

казак, забаўлянак, калыханак; адгадванне загадак; размовы: «Фальклор у нашым жыцці», «Беларуская мова для дзяцей», «Беларускія народныя казкі»; разгляданне малюнкаў да казак, калыханак, забаўлянак; беларускія народныя гульні «Кукарэку, певунок», «Гарлачык», «Шэры кот».

***Запланаваны вынік.*** У выхаванцаў пашырацца ўменні адрозніваць творы розных жанраў фальклору, павысіцца дапытлівасць, актыўнасць; замацуюцца ўменні адрозніваць характэрныя асаблівасці жанраў фальклору; сфарміруецца павага да культурнай спадчыны народа, цікавасць да роднай мовы.

**1. Уступная частка.**

*У госці да дзяцей завітаў Дзед Барадзед. У руках трымае куфар.*

**Дзед Барадзед (Д. Б.).** Прывітанне, дзеці! Я — Дзед Барадзед, абыйшоў увесь белы свет і завітаў да вас. Хачу вам паказаць свой чароўны куфар, у які я збіраю казкі, забаўлянкі, калыханкі, загадкі. Ці цікава вам паглядзець у мой куфар? (Адказы дзяцей.) Тады падыходзьце бліжэй і глядзіце.

*Дзед Барадзед адчыняе куфар, а ён пусты і ў ім дзюра.*

**Д. Б.** Ой, бяда! Мышы пагрызлі мой куфар, і я ўсё згубіў. Што рабіць? Дзеці, дапаможаце мне ўсё знайсці?

**Дзеці (Д).** Канешне, дапаможам.

*Гучыць музыка і дзеці разам з Дзедам Барадзедам адпраўляюцца ў падарожжа.*

**2. Асноўная частка.**

*Музыка сціхае, і «падарожнікі» сустракаюць герояў казак (пеўнік з касой, каза і вожык).*

**Д. Б.** Дзеці, паглядзіце, каго мы сустрэлі? Гэта героі з розных казак. Яны згубілі свае казкі. Дапамажыце ім знайсці кожнаму сваю.

**Д. Б.** З якой казкі пеўнік з касой? Хто яшчэ жыве ў гэтай казке? (Адказы дзяцей.)

**Д. Б.** А з якой казкі згубілася каза? Чаму казу называлі Манюка? (Адказы дзяцей.)

**Д. Б.** У якой казке жыў вожык? (Адказы дзяцей.) Чаму казка называецца «Пых»? (Адказы дзяцей.)

**Д. Б.** Малайцы! Вось мы і знайшлі казкі. Пакладзем іх у куфар. А зараз ідзем далей.

*Зноў гучыць музыка, дзеці разам з Дзедам Барадзедам ідуць далей. Тут на дарозе яны знаходзяць вялікі канверт. Дзед Барадзед яго адкрывае і знаходзіць карткі.*

**Д. Б.** Паглядзіце, дзеці, што я зайшоў. (Адказы дзяцей.) Так, правільна. Што ў ім? Гэта загадкі. Каб нам іх пакласці ў куфар, трэба іх адгадаць. Вы гатовы? (Адказы дзяцей.) А каб праверыць ваш адказ, ёсць карткі-адгадкі.

Два браты глядзяць у ваду, а ніколі не сойдуцца. *(Берагі.)*

Адзін лье, другі п'е, трэці расце. *(Дождж, зямля, трава.)*

Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці. *(Ноч.)*

**Д. Б.** Усё правільна адгадалі і карткі-адгадкі знайшлі. Вось і загадкі пакладзем у куфар. Пойдзем далей.

*Пад музычнае суправаджэнне падарожнікі працягваюць свой шлях. Сустракаюць Пеўніка.*

**Д. Б.** Пеўнік-певунок, ці не бачыў ты калыханкі і забаўлянкі, мы іх шукаем?

**Пеўнік.** Не, не бачыў. Але, калі вы са мною пагуляеце, я вам пакажу, як дайсці да Зайчыхі, мабыць, яна бачыла.

**Д. Б.** Добра, пагуляем.

***Фізкультурная хвілінка.***

**Гульня малой рухомасці «Пеўнік-певунок».**

*Дзеці становяцца кругам, у сярэдзіне стаіць Певень.*

**Дзеці.** Кукарэку, Певунок,

Дзе пашыў ты кажушок?

*Пеўнік ходзіць па крузе і адказвае.*

**Певень.** Сам пашыў я, сам надзеў

І ў люстэрка паглядзеў.

Буду песенькі спяваць,

Разам з ліскай танцаваць.

*Пеўнік спыняецца каля аднаго дзіцяці, і яны танцуюць. Гульня паўтараецца 3 разы.*

**Д. Б.** Цікава нам была з табою гуляць, Певен-певунок. Дзякуй табе. Сажы, дзе нам шукаць Зайчыху?

*Пеўнік паказвае падарожнікам, куды ісці.*

*Чуецца плач, і дзеці разам з Дзедам Барадзедам падыходзяць бліжэй. Сустракаюць Зайчыху і зайчаня (цацкі), якое плача.*

**Д. Б.** Прывітанне, Зайчыха. Што здарылася, чаму зайчаня плача?

**Зайчыха.** Ой, бяда. Зайчаня не хоча спаць, вось і плача.

**Д. Б.** Дзеці, давайце дапаможам і заспяваем калыханку, можа, зайчаня супакоіцца.

*Дзеці разам з Дзедам Барадзедам спяваюць калыханку.*

Баю-баю-баю-бай,

Не лажыся ты на край.

Прыйдзе шэранькі ваўчок,

Схопіць зайку за бачок

І пацягне ў лясок

Пад малінавы кусток.

*Зайчаня сціхае і засыпае. Зайчыха дае картку з малюнкам калыханкі. Дзед Барадзед кладзе яе ў куфар.*

**Д. Б.** Дзякуй табе, Зайчыха, вось і калыханка ў куфар вярнулася. Да пабачэння, нам трэба ісці далей.

*Гучыць музыка, і падарожнікі адпраўляюцца далей.*

*Падыходзяць да дошкі, на якой размешчаны малюнкі (мышка, карона, лыжкі, кавал сала, лаўка, халяўка, кошка).*

**Д. Б.** Дзеці, паглядзіце, што гэта за малюнкі? (Адказы дзяцей.) Давайце падумаем, адкуль усе яны. (Адказы дзяцей.) Так, яны ўсе з забаўлянкі «Мышка, мышка, дзе была?».

**Д. Б.** Ці гатовы вы расказаць гэту забаўлянку? (Адказы дзяцей.)

*Дзеці расказваюць забаўлянку пры дапамозе картак-малюнкаў.*

— Мышка, мышка, дзе была?

— Была ў пана караля.

— Што рабіла?

— Лыжкі мыла.

— А што далі?

— Кавал сала.

— Дзе паклала?

— Пад лаўкаю.

— Чым накрыла?

— Халяўкаю.

— Дзе падзела?

— Кошка з'ела.

*Дзед Барадзед збірае карткі і кладзе іх у куфар.*

**3. Заключная частка.**

**Д. Б.** Ой, які цяжкі куфар стаў. Мабыць, мы з вамі знайшлі ўсе мае казкі, загадкі, калыханкі і забаўлянкі. Якія вы ўсе малайцы!

**Д. Б.** Зараз час вяртацца нам у сад. Вы гатовы? (Адказы дзяцей.) Адпраўляемся.

*Гучыць музыка і дзеці разам з Дзедам Барадзедам вяртаюцца ў сад.*

**4. Рэфлексія.**

**Д. Б.** Дзякуй вам, дзеці, за дапамогу. Скажыце, а ці спадабалася вам наша падарожжа? Якія заданні вам падабалася выконваць? Можа, штосьці было для вас цяжкім? Успомніце, каго мы сустрэлі на сваім шляху?

**Д. Б.** Дзякуй вам, дзеці, яшчэ раз. А мне ўжо час адпраўляцца ў іншыя сады, каб паказаць ужо тым дзецям свой чароўны куфар. А за вашу дапамогу я падару вам лапці з беларускай народнай гульні «Лапці». Гуляйце, і мяне ўспамінайце. Да пабачэння!